# Критика и библиография

# Крытыка і бібліяграфія

# Review and bibliography

**Sejm Królestwa Polskiego i Rzeczypospolitej Obojga Narodów a europejskie reprezentacji stanowe** / red. nauk.: D. Kupisz, W. Uruszczak. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2019. 295 s.

**The diet of the Polish Kingdom and the Polish-Lithuanian Commonwealth and European representative assemblies of estates** / ed. by D. Kupisz, W. Uruszczak. Warsaw : Wydaw. Sejm., 2019. 295 p. (in Pol.).

У 2018 г. у Варшаве і Пётркаве адбыліся дзве міжнародныя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя 550-годдзю парламентарызму Польшчы і Рэчы Паспалітай. Нагодай для правядзення гэтых форумаў стаў адпаведны юбілей склікання ў 1468 г. першага ў польскай гісторыі двухпалатнага сойма, на якім былі прадстаўлены не толькі члены каралеўскай рады (сенат), але і абраныя на мясцовых сойміках паслы ад шляхты (пасольская ізба). Большая частка прачытаных на канферэнцыях дакладаў і стала асновай выдадзенага ў наступным годзе зборніка навуковых артыкулаў. Рэдактары кнігі – знаныя польскія даследчыкі: спецыяліст па ваеннай гісторыі і гісторыі шляхты Дарыюш Купіш і гісторык права Вацлаў Урушчак. Усяго ў зборніку змешчаны 15 артыкулаў, напісаных навукоўцамі з Польшчы, Венгрыі, Літвы і Украіны, таксама ёсць уводзіны і асабовы індэкс.

Пры падборы тэкстаў выдаўцы паставілі перад сабой мэту асвятліць праблемы генезісу і функцыянавання інстытута сойма ў XIV–XVIII стст. на фоне саслоўных сходаў тагачаснай Еўропы. У змесце зборніка можна вылучыць некалькі тэматычных блокаў.

Так, чатыры артыкулы прысвечаны розным старонкам гісторыі сойма Каралеўства Польскага на працягу XIV–XVI стст. Войцех Фалкоўскі разгледзеў працэс станаўлення польскага вальнага сойма ў канцы XIV – першай палове XV ст. з улікам росту палітычнага значэння не толькі вышэйшых свецкіх і духоўных ураднікаў, але і шырокіх колаў шляхты. Адзін з рэдактараў выдання Вацлаў Урушчак прадставіў грунтоўныя аргументы на карысць тэзіса аб тым, што першы двухпалатны сойм Каралеўства Польскага адбыўся ў 1468 г., а не ў 1493 г., як лічылася ў ранейшай гістарыяграфіі. Лешак Вяржбіцкі падрабязна паказаў пазіцыю польскіх сенатараў і земскіх паслоў па пытанні шлюбу новага караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста з Барбарай Радзівіл, якое стала ключавым на сойме 1548 г. у Пётркаве. У сваю чаргу, Эва Дубас-Урвановіч правяла параўнаўчы аналіз каронных соймаў да і пасля 1562 г. Менавіта ў гэтым годзе Жыгімонт Аўгуст выразна падтрымаў «экзекуцыйны» рух польскай шляхты, якая выступала з праграмай маштабных дзяржаўных рэформ, у тым ліку і з пастулатам заключэння новай уніі з Вялікім Княствам Літоўскім. Даследчыца трапна вызначыла тыя матывы, якія падштурхнулі манарха да супрацоўніцтва са шляхтай (адсутнасць мужчынскіх нашчадкаў, цяжкае фінансавае становішча ва ўмовах вайны з Маскоўскай дзяржавай, палітычная і ідэйная слабасць кароннага сената). І хаця названыя артыкулы датычаць менавіта сойма Каралеўства Польскага, але ў іх можна знайсці і даследчыя сюжэты, важныя для вывучэння гісторыі вальнага сойма Вялікага Княства Літоўскага (напрыклад, станаўленне інстытута прадстаўніцтва або развіццё палітычнай культуры шляхецкага грамадства).

Гісторыі супольнага вальнага сойма Рэчы Паспалітай прысвечаны пяць артыкулаў, аднак храналагічна яны падзяляюцца вельмі нераўнамерна: чатыры з іх закранаюць перыяд другой паловы XVII – XVIII ст. Так, Дарыюш Купіш прааналізаваў соймавыя канстытуцыі, якія датычылі арганізацыі кароннага войска і былі ўхвалены ў 1648–1655 гг., гэта значыць ад пачатку паўстання Багдана Хмяльніцкага да ўварвання ў Рэч Паспалітую шведскіх



cc BY NC

войскаў. У матэрыяле Роберта Каладзея праведзены ўважлівы разбор асаблівасцей функцыянавання вальнага сойма ў час панавання караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна III Сабескага (1674–1696). Аўтар прыйшоў да высновы, што перыяд 1688–1695 гг. – адзін з пераломных момантаў у паглыбленні крызісу інстытута сойма. Пашырэнне практыкі зрыву соймавых пасяджэнняў нават яшчэ да абрання маршалка пасольскай ізбы стала вынікам унутранай палітычнай барацьбы паміж каралеўскім дваром і магнацкай групоўкай Сапегаў і прывяло да страты шанцаў на рэфармаванне парламента. Па сутнасці, гэты час засведчыў значны заняпад палітычнай культуры шляхты Рэчы Паспалітай. Анджэй Страйноўскі разглядае маладаследаваную праблему ролі сената ў дзейнасці вальнага сойма і змен гэтай ролі на працягу XVIII ст. Адносіны паміж парламентам і органамі выканаўчай улады Рэчы Паспалітай у 1764–1786 гг. сталі прадметам даследавання Вітальда Філіпчака. А вось перыяду апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст. прысвечаны толькі артыкул Наталлі Старчанка. Каб паказаць суіснаванне на рэгіянальным узроўні Статута ВКЛ 1566 г., які працягваў дзейнічаць ва ўкраінскіх ваяводствах пасля іх далучэння да Каралеўства Польскага ў 1569 г., і каронных соймавых канстытуцый, даследчыца грунтоўна прааналізавала як судовую практыку Валынскага ваяводства, так і мясцовыя соймікавыя матэрыялы. Аўтар даводзіць, што барацьба за захаванне «свайго права», з аднаго боку, пашырала сярод валынскай (і, шырэй, украінскай) шляхты ўсведамленне ўласнай суб'ектнасці ў складзе Каралеўства Польскага, а з другога – спрыяла ўмацаванню еднасці шляхецкага саслоўя на ўзроўні ўсёй Рэчы Паспалітай. Падкрэслім, што без уліку падобнага перапляцення партыкулярных і ўніфікатарскіх тэндэнцый немагчыма ў поўнай ступені адлюстраваць спецыфіку палітычнага развіцця аб'яднанай дзяржавы. На вялікі жаль, у зборніку не аказалася ніводнага артыкула, які б быў прысвечаны парламенцкім структурам Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай або яго прадстаўніцтву на супольным сойме. Парламенцкая сістэма ВКЛ да XVIII ст. захоўвала значныя асаблівасці[1], і разгляд інстытута вальнага сойма без іх уліку з'яўляецца далёка не поўным.

Два артыкулы зборніка прадстаўляюць скразны погляд на гісторыю сойма ў часы Каралеўства Польскага і Рэчы Паспалітай. Так, Эдвард Апаліньскі на падставе аналізу кар'еры 213 каталіцкіх біскупаў паспрабаваў паказаць шляхі палітычнага авансу каронных і велікакняжацкіх духоўных сенатараў у XVI–XVII стст. Біскупы з'яўляліся даволі спецыфічнай супольнасцю, паколькі, з аднаго боку, былі святарамі, а з другога – палітыкамі, членамі сената. Даследаванне выразна паказала, што асновай царкоўнай кар'еры для пераважнай большасці біскупаў служыла менавіта грамадска-палітычная дзейнасць на карысць манарха і дзяржавы. Вацлаў Урушчак у яшчэ адным сваім артыкуле, змешчаным у зборніку, разглядае ролю парламентарызму ў развіцці дзяржаўнага ладу Польшчы і Рэчы Паспалітай. Імкнучыся адысці ад распаўсюджаных паняццяў тыпу і формы дзяржавы, аўтар прапануе карыстацца тэрмінам «прынцып уладкавання», якім акрэслівае асноватворныя ўзаемаадносіны ў сферы сацыяльнага і палітычнага ладу той ці іншай краіны. І хоць не з усімі прапанаванымі прынцыпамі ўладкавання Рэчы Паспалітай можна цалкам пагадзіцца (напрыклад, з прынцыпамі рэлігійнай талерантнасці або падзелу ўлады), але парламентарызм сапраўды меў фундаментальнае значэнне ў сацыяльна-палітычным жыцці гэтага дзяржаўнага ўтварэння. Праўда, сур'ёзнае пярэчанне выклікае характарыстыка Вацлавам Урушчакам Рэчы Паспалітай як «адзінай дзяржавы, у якой ніводная з яе складовых частак не захавала ўласнай суверэннай лакальнай улады»[2] (s. 51). На наш погляд, Вялікае Княства Літоўскае пасля Люблінскай уніі 1569 г. захавала не толькі «шэраг асаблівасцей у прававой сістэме», але мела частковы суверэнітэт[3], што дазваляе казаць аб федэратыўнай аснове Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

Як адзначалася вышэй, рэдактары зборніка імкнуліся прадставіць гісторыю кароннага сойма ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Аднак можна меркаваць, што гэта мэта была дасягнута толькі часткова. Дарыюш Макіла на прыкладзе Францыі, Англіі і Польшчы тэзісна падаў тры тэарэтычныя мадэлі фарміравання агульнадзяржаўных прадстаўнічых сходаў на працягу XIII–XVI стст. з улікам ролі ў гэтым працэсе манарха і станаў грамадства. Даніэль Багі, разглядаючы пачаткі парламентарызму ў Венгерскім Каралеўстве, сканцэнтраваў увагу на рашэннях з'езда 1351 г. Аўтар аспрэчвае распаўсюджанае меркаванне,

[1] Гл., напрыклад: *Rachuba A.* Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2002 ; *Zakrzewski A.* Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). Prawo – ustrój – społeczeństwo. Warszawa : Campigodlio, 2013. S. 88–117.

[2] Тут і далей пераклад наш. – *У. П.*

[3] І пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай шляхта Вялікага Княства Літоўскага мела магчымасць абараняць і рэалізоўваць свае сацыяльна-палітычныя інтарэсы ў справах унутранай і – у меншай ступені – знешняй палітыкі. Захоўваліся асобныя ўладныя інстытуты, судовая і прававая сістэма, афіцыйная мова справаводства (да 1697 г.) і дзяржаўная сімволіка. Правядзенне ўласных заканадаўчых галоўных з'ездаў ці з'ездаў часоў бескаралеўя было важным інструментам абароны дзяржаўных інтарэсаў ВКЛ. Статут 1588 г. гарантаваў вяршэнства правоў велікакняжацкай шляхты на сваёй тэрыторыі. Падрабязней гл., напрыклад: *Падалінскі У.* Барацьба шляхты за суверэнітэт ВКЛ пасля Люблінскай уніі 1569 г. // Беларус. гіст. часоп. 2016. № 7. С. 23–28.

згодна з якім менавіта гэты з’езд стаў пачаткам генезісу саслоўнай манархіі ў Венгрыі, і не бачыць у ім прадвесніка парламенцкіх сходаў XV ст. Нарэшце, літоўская даследчыца Юратэ Кяўпене паказала станаўленне інстытута вальнага сойма ў кантэксце мадэрнізацыйных працэсаў у Вялікім Княстве Літоўскім ад пачатку XV ст. да 1569 г. У артыкуле адзначаецца эвалюцыйнае развіццё ў ВКЛ новых палітычных структур: паноў-рады, сойма, палітычнага народа. Цалкам можна пагадзіцца з высновай, што вырашальным этапам у афармленні вальнага сойма стаў канец XV – першая палова XVI ст. А вось зараджэнне сістэмы саслоўнага прадстаўніцтва ў дзяржаве Юратэ Кяўпене адносіць да часу панавання вялікага князя літоўскага Вітаўта (1392–1430). На нашу думку, генезіс парламентарызму ў Вялікім Княстве Літоўскім патрэбна звязваць са скліканнем з’ездаў князёў і вышэйшых колаў баярства, якія фармальна мелі агульнадзяржаўны характар ды фіксуюцца ўжо як мінімум з пачатку XIV ст.[4] Акрамя таго, варта памятаць, што некаторыя землі ВКЛ (напрыклад, Жамойцкая, Полацкая, Віцебская) захоўвалі ўласныя традыцыі парламенцкага жыцця, карані якіх палягаюць яшчэ ў перыядзе вечавых сходаў. Сярод праяў мадэрнізацыі Вялікага Княства Літоўскага хацелася б назваць яшчэ і працэс стварэння агульнадзяржаўнага пісьмовага права, што распачаўся з прывілея вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча ад 2 мая 1447 г. Агульнае права і вальны сойм спрыялі фарміраванню адзінага палітычнага народа ВКЛ, які аб’ядноўваў усю палітычна актыўную шляхту незалежна ад яе тэрытарыяльнай, этнічнай і канфесійнай прыналежнасці. Зборнік завяршаецца нарысам Эдварда Апаліньскага, у якім выдатны польскі гісторык акрэслівае найважнейшыя кірункі далейшых даследаванняў парламенцкай сістэмы Каралеўства Польскага і Рэчы Паспалітай абодвух народаў. На думку аўтара, вузлавымі пытаннямі ў вывучэнні парламентарызму з’яўляюцца гісторыка-прававое і сацыяльна-палітычнае вымярэнні функцыянавання павятовых соймікаў, а таксама роля ў працы вальнага сойма трох яго складовых частак: караля, сената і пасольскай ізбы. Актуальнай задачай паранейшаму застаецца комплекснае выданне соймавых дыярыушаў і соймікавых дакументаў.

Такім чынам, рэцэнзаваны зборнік з’яўляецца важным крокам у вывучэнні гісторыі прадстаўнічых інстытутаў улады Цэнтральна-Усходняй Еўропы перыяду Сярэдневякоўя і ранняга Новага часу, а таксама можа быць добрым грунтам для далейшых даследаванняў у дадзенай галіне. Асабліва хацелася б падкрэсліць высокі навуковы ўзровень усіх прадстаўленых у выданні артыкулаў. Спадзяёмся, што і ў беларускай гістарычнай навуцы актывізуюцца даследаванні парламенцкіх традыцый Вялікага Княства Літоўскага і ўсёй Рэчы Паспалітай.

***У. А. Падалінскі***[5]

[4]Пад 1305 г. у хроніцы Пятра з Дусбурга паведамляецца пра напад аддзела крыжакоў на з’езд ВКЛ, на якім вялікі князь Віцень «сабраў амаль усіх магнатаў свайго каралеўства… на пэўнай нарадзе ці парламенце» (Петр из Дусбурга. Хроника земли Прусской. М. : Ладомир, 1997. С. 163–164). Аб скліканні падобных протапарламенцкіх сходаў у сярэдневяковай Еўропе гл., напрыклад: *Blockmans W. P.* A typology of representative institutions in late medieval Europe // J. of Mediev. Hist. 1978. Vol. 4, issue 2. P. 189–215 ; *Russocki S.* Narodziny zgromadzeń stanowych // Prz. Hist. 1968. T. 59, zesz. 2. S. 214–226 ; *Idem.* Zgromadzenia przedstanowe środkowej Europy. Wstępna analiza porównawcza // Czas. Praw.-Hist. 1973. T. 25, zesz. 2. S. 1–17.

[5]*Владимир Алексеевич Подолинский* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Уладзімір Аляксеевіч Падалінскі* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Uladzimir A. Padalinski*, PhD (history), docent; head of the department of Belarus history of the ancient time and the Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *ulpadalinski1978@gmail.com*